Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
__________ А. В. Данільчанка
(подпіс)
28.06.2016
(дата зацвярджэння)
Рэгістрацыйны № УД-2351 / уч.

# ЛАЦІНСКАЯ МОВА

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці

1-21 05 01 Беларуская філалогія
(па напрамках)

2016 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове АСВА 1-21 05 01-2013, тыпавой вучэбнай праграмы для ВНУ ад 31.12.2008 г. № ТД-D.067/тып., вучэбных планаў УВА № Д 21-079/уч. 2013 г., № Д 21-080/уч. 2013 г., № Д 21-081/уч. 2013 г., № Д 21з-091/уч. 2013 г., № Д 21з-092/уч. 2013 г., № Д 21з-100/уч. 2013 г., № Д 21з-101/уч. 2013 г., № Д 21з-102/уч. 2013 г. для спецыяльнасці 1-21 05 01 Беларуская філалогія (па напрамках).

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

**Пракапчук Вольга Генрыхаўна**, дацэнт кафедры класічнай філалогіі, к. ф. н., дацэнт;

**Тананушка Кір Аляксеевіч**, дацэнт кафедры класічнай філалогіі.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

кафедрай класічнай філалогіі філалагічнага факультэта (пратакол № 5 ад 25.01.2016 г.);

навукова-метадычным саветам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (пратакол № 3 ад 25.01.2016 г.).

# I. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Лацінская мова з'яўляецца дысцыплінай, якая спрыяе выпрацоўцы навуковага падыходу да вывучэння сучасных моў. Пры дапамозе параўнальна-гістарычнага метаду даследавання наглядна даказваецца генетычная роднасць лацінскай мовы і сучасных моў, якія вывучаюцца студэнтамі (як беларускай, так і замежных). Вывучэнне слоўнікавага складу лацінскай мовы дазваляе студэнтам наглядна разгледзець дэрывацыйныя працэсы і палягчае свядомае засваенне як лацінскай лексікі, так і лексікі сучасных еўрапейскіх моў.

**Мэта** вывучэння дысцыпліны – выпрацоўка навыкаў філалагічнага аналізу іншамоўнай (лацінскай) крыніцы, а таксама дапамога ў засваенні новых еўрапейскіх моў і паглыбленне разумення беларускай мовы.

Таксама мэтай вывучэння лацінскай мовы з'яўляецца засваенне міжнароднай лацінскай тэрміналогіі ў вобласці гуманітарных навук.

Вывучэнне латыні дазваляе студэнтам больш наглядна ўяўляць працэс фармавання сучасных еўрапейскіх моў і палягчае разуменне іх адметных асаблівасцяў.

**Задачы** вывучэння дысцыпліны:

• даць цэласнае ўяўленне пра фанетыку, марфалогію, лексіку і сінтаксіс лацінскай мовы;

• выпрацаваць навыкі філалагічнага аналізу лацінскага тэксту;

• забяспечыць трывалае замацаванне ў памяці вызначанага лексічнага запасу лацінскай мовы;

• выпрацаваць уменне знаходзіць міжмоўныя сувязі лацінскай мовы і сучасных еўрапейскіх моў.

У сістэме падрыхтоўкі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй вывучэнне лацінскай мовы непарыўна звязана з такімі вучэбнымі дысцыплінамі, як замежныя мовы, агульнае мовазнаўства, гісторыя замежнай літаратуры, сучасная беларуская мова.

Лацінская мова ўваходзіць у лік:

• дысцыплін па выбары студэнта кампанента ўстановы вышэйшай адукацыі цыкла спецыяльных дысцыплін (для вочнай формы атрымання вышэйшай адукацыі і завочнай формы атрымання вышэйшай адукацыі з тэрмінам навучання 5 гадоў);

• дысцыплін спецыяльнасці абавязковага кампанента ўстановы вышэйшай адукацыі цыкла агульна-прафесійных і спецыяльных дысцыплін (для завочнай формы атрымання вышэйшай адукацыі на базе ССА з тэрмінам навучання 4 гады).

Засваенне дысцыпліны павінна забяспечыць фарміраванне наступных **кампетэнцый**:

***1) акадэмічных:***

• умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач;

• валодаць сістэмным і параўнальным аналізам;

• валодаць даследчымі навыкамі;
• умець працаваць самастойна;
• валодаць міждысцыплінарным падыходам пры рашэнні праблем;
***2) сацыяльна-асобасных:***
• умець працаваць у калектыве;
***3) прафесійных:***
• працаваць з навуковай, тэхнічнай і патэнтнай літаратурай.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнты **павінны**:

• ***ведаць***:

– фанетычны, лексічны, граматычны склад лацінскай мовы (вымаўленчыя нормы, парадыгмы скланенняў і спражэнняў; асноўную лексіку і фразеалогію);

– філалагічную тэрміналогію;

– гісторыю і культуру Старажытнага Рыма;

• ***умець***:

– выконваць марфалагічны, сінтаксічны аналіз тэксту на лацінскай мове;

– распазнаваць лексемы лацінскай мовы, якія ўвайшлі ў склад беларускай мовы, раманскіх і германскіх моў;

– распазнаваць марфемы лацінскай мовы ў словах, запазычаных у іншыя мовы;

– перакладаць лацінскія тэксты на беларускую мову;

• ***валодаць***:

– навыкамі граматычнага аналізу і перакладу лацінскага тэксту на беларускую мову;

– слоўнікавым запасам лацінскіх лексем, афарызмамі.

Форма атрымання вышэйшай адукацыі: вочная, завочная.

Агульная колькасць гадзін і колькасць аўдыторных гадзін, якая адводзіцца на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны ў адпаведнасці з вучэбным планам установы вышэйшай адукацыі, размеркаванне аўдыторнага часу па відах заняткаў, курсам і семестрам, формы бягучай атэстацыі па вучэбнай дысцыпліне:

## А. Вочная форма атрымання адукацыі

| | | |
|---|---|---|
| Курсы | I–II | |
| Семестры | II–III | |
| Агульная колькасць гадзін | 154 | |
| Колькасць аўдыторных гадзін | 76 | |
| Размеркаванне аўдыторных гадзін па семестрах | II | III |
| Колькасць аўдыторных гадзін | 38 | 38 |
| • Практычныя (семінарскія) заняткі | 30 | 30 |
| • КСР | 8 | 8 |
| Форма бягучай атэстацыі | Залік (II сем.) | Экзамен (III сем.) |

## Б. Завочная форма атрымання адукацыі

| | | | |
|---|---|---|---|
| Курсы | II–III | | |
| Семестры | III–IV–V | | |
| Агульная колькасць гадзін | 154 | | |
| Колькасць аўдыторных гадзін | 20 | | |
| Размеркаванне аўдыторных гадзін па семестрах | III | IV | V |
| Колькасць аўдыторных гадзін | 4 | 4 | 12 |
| • Практычныя (семінарскія) заняткі | 4 | 4 | 12 |
| Кантрольная работа | — | № 1 | № 2 |
| Форма бягучай атэстацыі | — | Залік (IV сем.) | Экз. (V сем.) |

## В. Завочная форма атрымання адукацыі (на базе ССА)

| | | | |
|---|---|---|---|
| Курсы | IV–V | | |
| Семестры | VII–VIII–IX | | |
| Агульная колькасць гадзін | 172 | | |
| Колькасць аўдыторных гадзін | 20 | | |
| Размеркаванне аўдыторных гадзін па семестрах | VII | VIII | IX |
| Колькасць аўдыторных гадзін | 6 | 4 | 10 |
| • Практычныя (семінарскія) заняткі | 6 | 4 | 10 |
| Кантрольная работа | — | № 1 | № 2 |
| Форма бягучай атэстацыі | — | Залік (VIII сем.) | Экз. (IX сем.) |

# II. ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## I

## УВОДЗІНЫ

### Месца і роля лацінскай мовы ў культурна-гістарычным развіцці еўрапейскай цывілізацыі. Гісторыя яе станаўлення і развіцця

Паняцце «лацінская мова». Кароткі нарыс гісторыі лацінскай мовы. Перыяды развіцця лацінскай мовы ў антычную эпоху. Першыя пісьмовыя помнікі. Уплыў грэчаскай мовы. Функцыянаванне лацінскай мовы ў Сярэднія вякі, у эпоху Адраджэння, у эпоху Асветы. Роля лацінскай мовы ў гісторыі культуры Еўропы. Лацінская мова на тэрыторыі ВКЛ. Роля лацінскай мовы ў гісторыі культуры Беларусі. Лацінамоўная літаратура Беларусі.

Уплыў лацінскай мовы на фармаванне новых нацыянальных моў Еўропы. Народная латынь як мова-аснова раманскіх моў.

Кароткая характарыстыка лацінскай мовы як індаеўрапейскай мовы сінтэтычнага ладу.

Роля лацінскай мовы ў фармаванні міжнароднай навуковай тэрміналогіі. Лацінскія формулы, выразы, выслоўі. Значэнне лацінскай мовы ў наш час.

## ФАНЕТЫКА І ГРАФІКА

Лацінскі алфавіт. Умоўнасць сучаснага вымаўлення лацінскіх літар. Дыфтонгі **au**, **eu**. Дыграфы **ae**, **oe**. Вымаўленне **j** перад галоснымі напачатку слова і паміж галоснымі ў сярэдзіне. Вымаўленне **c**, спалучэнняў **ch**, **ph**, **rh**, **th**, **ti**, **qu**, **ngu**, **su**. Працягласць і кароткасць складоў па прыродзе і па становішчы. Правілы націску.

## II

## МАРФАЛОГІЯ

### *Назоўнік*

Граматычныя катэгорыі назоўніка. Характарыстыка сістэмы скланення ў лацінскай мове. Пяць скланенняў лацінскіх назоўнікаў. Правіла вызначэння скланення. Практычная і гістарычная асновы назоўніка.

1-е скланенне. Гістарычная аснова назоўнікаў (**ā**). Парадыгма скланення. Род назоўнікаў 1-га скланення.

2-е скланенне. Гістарычная аснова (**ŏ/ĕ**). Склонавыя канчаткі. Радавая прыналежнасць назоўнікаў 2-га скланення, выключэнні з правіла роду. Правіла ніякага роду. Асаблівасці ўтварэння клічнага склону.

3-е скланенне. Гістарычныя асновы (зычны, **i**). Зычны, галосны і змешаны тыпы 3-га скланення. Сістэма склонавых канчаткаў. Сігматычны і нулявы nominativus singularis. Правіла роду назоўнікаў 3-га скланення і выключэнні. Асаблівасці скланення некаторых назоўнікаў.

4-е скланенне. Гістарычная аснова (**ŭ**). Склонавыя канчаткі. Род назоўнікаў 4-га скланення і выключэнні. Асаблівасці скланення некаторых назоўнікаў (*domus*).

5-е скланенне. Гістарычная аснова (**ē**). Склонавыя канчаткі. Род назоўнікаў 5-га . Асаблівасці 5-га скланення.

Супастаўляльны аналіз усіх пяці скланенняў. Лацінскія скланенні як адзіная сістэма, што ўзыходзіць да перыяду індаеўрапейскага моўнага стану; параўнанне з сістэмай скланення ў старажытнагрэчаскай, старaславянскай і беларускай мовах.

### *Прыметнік*

Сістэма прыметнікаў у лацінскай мове.

Прыметнікі 1–2-га скланення.

Прыметнікі 3-га скланення. Тыпы прыметнікаў трэцяга скланення ў залежнасці ад колькасці радавых канчаткаў у nominativus singularis. Скланенне прыметнікаў і некаторыя асаблівасці.

Ступені параўнання прыметнікаў. Спосабы ўтварэння ступеняў параўнання: суфіксальныя і апісальныя (аналітычныя). Скланенне прыметнікаў у вышэйшай і найвышэйшай ступені. Суплетыўныя ступені параўнання. Абсалютнае і адноснае значэнне ступеняў параўнання ў лацінскай мове.

### *Займеннікі*

Асабовыя займеннікі. Суплетыўнасць склонавых формаў асабовых займеннікаў. Параўнанне з іншымі індаеўрапейскімі мовамі.

Зваротны займеннік і правілы яго ўжывання; супадзенне формаў адзіночнага і множнага ліку.

Постпазіцыя прыназоўніка *cum* у спалучэнні з асабовымі і зваротным займеннікамі.

Прыналежныя займеннікі і іх скланенне. Правілы ўжывання прыналежных займеннікаў.

Указальныя займеннікі і іх скланенне. Ужыванне ўказальных займеннікаў у значэнні асабовых займеннікаў трэцяй асобы. Суадносныя значэнні ўказальных займеннікаў.

Пытальныя і адносныя займеннікі і іх скланенне.

Адмоўныя займеннікі, іх структура (складовыя часткі) і скланенне.

Неазначальныя займеннікі, асаблівасці іх утварэння і скланення.

Займеннікавыя прыметнікі. Асаблівасці іх скланення.

Займеннікі як найбольш устойлівы пласт лексікі індаеўрапейскіх моў. Генетычная роднасць займеннікаў у лацінскай, стараславянскай, старажытнагрэчаскай і беларускай мовах.

### *Прыслоўі*

Невытворныя прыслоўі. Спосабы ўтварэння прыслоўяў ад прыметнікаў 1–2-га і 3-га скланення. Ужыванне ў якасці прыслоўяў застылых склонавых формаў назоўнікаў і прыметнікаў. Ступені параўнання прыслоўяў.

### *Лічэбнікі*

Катэгорыі лічэбнікаў: колькасныя, парадкавыя, раздзяляльныя, лічэбнікі-прыслоўі. Скланенне лічэбнікаў. Ужыванне склонавых формаў імён пры колькасных лічэбніках у лацінскай мове. Дапасаванне складаных парадкавых лічэбнікаў да назоўнікаў. Скланенне лічэбнікаў *unus*, *duo*, *tres* і *milia*. Генетычная блізкасць лічэбнікаў у шэрагу індаеўрапейскіх моў. Рымскія лічбы.

### *Дзеяслоў*

Граматычныя катэгорыі дзеяслова: асоба, лік, час, лад, стан. Асноўныя формы дзеяслова і тры дзеяслоўныя асновы. Вызначэнне спражэння дзеясловаў па канцавым гуку асновы інфекта. Супрацьпастаўленне асноў перфекта і інфекта і іх трывальнае значэнне. Паходжанне лацінскага перфекта ад старажытных індаеўрапейскіх формаў перфекта і аорыста. Асабовыя і неасабовыя формы дзеяслова.

Сістэма інфекта. Асабовыя формы praesens, imperfectum, futurum I y indicativus і conjunctivus незалежнага і залежнага стану. Асабовыя канчаткі незалежнага і залежнага стану. Утварэнне формаў imperativus у praesens і futurum. Выказванне забароны.

Сістэма перфекта. Асабовыя формы perfectum, plusquamperfectum, futurum II y indicativus і conjunctivus незалежнага стану. Асабовыя канчаткі незалежнага стану перфекта.

Аналітычныя формы залежнага стану ў сістэме перфекта і іх супастаўленне з формамі залежнага стану ў стараславянскай і беларускай мовах.

Неасабовыя формы дзеяслова. Утварэнне і значэнне participium praesentis activi, participium perfecti passivi, participium futuri activi. Сістэма інфінітываў лацінскага дзеяслова. Аддзеяслоўны назоўнік (герундый) і аддзеяслоўны прыметнік (герундыў), іх скланенне. Супін I і супін II. Генетычная роднасць лацінскага і стараславянскага супіна.

Апісальнае спражэнне незалежнага і залежнага стану.

Адкладальныя і паўадкладальныя дзеясловы.

Няправільныя дзеясловы. *Esse* і вытворныя ад яго; гістарычная роднасць дзеяслова *быць* у індаеўрапейскіх мовах. Дзеясловы *volo*, *nolo*, *malo*; *fero* і вытворныя ад яго; *eo* і вытворныя ад яго; *fio*.

### *Прыназоўнікі*

Прыназоўнікі, іх ужыванне са склонамі (accusativus, ablativus). Постпазітыўнае ўжыванне прыназоўнікаў з genetivus. Постпазітыўнае зліццё прыназоўніка *cum* з займеннікамі.

### *Злучнікі*

Злучнікі злучальныя (злучальныя, раздзяляльныя, супраціўныя, заключныя) і падпарадкавальныя.

### *Адмоўі. Пытальныя часціцы. Выклічнікі*

Адмоўі. Пытальныя часціцы. Выклічнікі.

## СІНТАКСІС

### *Просты сказ*

Дзейнік і выказнік. Спосабы іх выразу. Асабовыя займеннікі ў ролі дзейніка ў лацінскай мове. Просты і састаўны выказнік. Асаблівасці дапасавання іменнай часткі выказніка да дзейніка. Выпадкі дапасавання па сэнсе. Адмоўная канструкцыя. Незалежная і залежная канструкцыі.

Парадак слоў у сказе ў супастаўленні з беларускай і іншымі славянскімі мовамі.

### *Сінтаксічныя функцыі склонаў*

Nominativus – склон дзейніка і іменнай часткі выказніка. Nominativus duplex.

Vocativus – склон звароту. Рэлікты клічнага склону ў беларускай і іншых славянскіх мовах.

Genetivus – склон недапасаванага азначэння і ўскоснага дапаўнення. Genetivus possessivus, subjectivus, objectivus, partitivus, characteristicus, qualitatis.

Dativus – склон ускоснага дапаўнення. Dativus commodi/incommodi, possessivus, finalis, duplex.

Accusativus – склон прамога дапаўнення. Accusativus duplex, limitationis, exclamationis, adverbialis, Graecus.

Ablativus – сінкрэтычны склон, які аб’яднаў функцыі індаеўрапейскіх аддзяляльнага, інструментальнага і меснага склонаў. Ablativus separationis, temporis, loci, auctoris, comparationis, instrumenti, causae, originis, qualitatis, modi.

Беспрыназоўнікавае ўжыванне назваў гарадоў у значэнні ablativus separationis, loci і accusativus extentionis.

Адрозненні ў склонавым кіраванні дзеясловаў аднаго значэння ў лацінскай і беларускай мовах.

### *Сінтаксіс дзеяслова*

Сінтаксічныя функцыі інфінітыва, яго субстантывацыя. Infinitivus historicus.

Сінтаксічныя звароты accusativus cum infinitivo, nominativus cum infinitivo. Часавыя значэнні інфінітыва ў інфінітыўных зваротах.

Значэнні кан'юнктыва ў незалежным сказе: conjunctivus hortativus, jussivus, optativus, prohibitivus, potentialis, dubitativus.

Герундый. Ужыванне склонаў герундыя.

Герундыў у значэнні азначэння і ў значэнні іменнай часткі выказніка. Асабовая і безасабовая канструкцыя з герундывам.

Дзеепрыметнікі. Дзеепрыметнікі ў функцыі азначэння (participium attributivum) і ў прэдыкатыўнай функцыі (participium praedicativum). Ablativus absolutus, яго значэнне і спосабы перакладу. Параўнанне з genetivus absolutus у старажытнагрэчаскай мове і давальным самастойным у стараславянскай і старабеларускай мовах.

Ужыванне supinum I і supinum II.

### *Сінтаксіс складанага сказа*

Даданыя сказы з выказнікам у індыкатыве і кан'юнктыве. Значэнне лацінскага кан'юнктыва ў даданых сказах. Правіла паслядоўнасці часоў (consecutio temporum). Тыпы даданых сказаў: ускоснае пытанне, даданыя часу са злучнікам cum temporale, cum historicum, са злучнікамі postquam, ubi, ubi primum і інш., даданыя мэты (ut, ne finale), дапаўняльныя (ut, ne objectivum), выніку (ut consecutivum), прычыны – са злучнікамі quod, quia, quoniam і cum causale, даданыя ўступальныя (cum concessivum і іншыя злучнікі), умоўныя сказы рэальнага, патэнцыйнага і ірэальнага віду. Attractio modi. Ускосная мова.

## СЛОВАЎТВАРЭННЕ

Найбольш ужывальныя лацінскія суфіксы і прэфіксы. Прадуктыўнасць некаторых з іх у беларускай мове. Прыназоўнікавыя і непрыназоўнікавыя прэфіксы. Змена каранёвай галоснай у прэфіксальных дзеясловах. Асіміляцыя апошніх гукаў прэфіксаў з пачатковымі гукамі кораня.

Інтэрнацыянальныя афіксы. (Словаўтварэнне вывучаецца падчас азнаямлення з граматычным ладам мовы.)

## ЛЕКСІКА

Лексічнае багацце лацінскай мовы. Практычныя прыёмы працы са слоўнікам. Лацінскія запазычанні ў беларускай і заходнееўрапейскіх мовах. (Лексіка вывучаецца падчас азнаямлення з граматычным ладам мовы.)

## АСНОВЫ РЫМСКАГА ВЕРШАСКЛАДАННЯ

Чаргаванне працяглых і кароткіх складоў – асноўны прынцып рымскага вершаскладання. Элізія. Асноўныя віды стоп: ямб, дактыль, спандэй, трахей. Некаторыя вершаваныя памеры і строфы (гекзаметр, элегічны дыстых, ямбічны трыметр і інш.). Цэзура. Сучаснае чытанне лацінскіх вершаў і пераклад памерам арыгінала.

## МАТЭРЫЯЛЫ ДЛЯ ЧЫТАННЯ

Пры праходжанні элементарнага курсу граматыкі чытаюцца асобныя фразы, у лік якіх уваходзяць сентэнцыі, прыказкі, цытаты са старажытных аўтараў, што ўяўляюць пазнавальную цікавасць. Таксама вывучаюцца звязныя тэксты гістарычнага і міфалагічнага зместу. Чытанне тэксту суправаджаецца каментарыямі граматычнага, стылістычнага і рэальнага характару.

# III. ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫЯ КАРТЫ

## А. ВОЧНАЯ ФОРМА АТРЫМАННЯ АДУКАЦЫІ

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | Семінарскія заняткі | Лабараторныя заняткі | Іншае | | |

### II семестр

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **1.** | **УВОДЗІНЫ. ФАНЕТЫКА І ГРАФІКА** | | **2** | | | | | |
| 1.1. | Занятак 1. Гісторыя лацінскай мовы. Фанетыка і графіка<br>Месца лацінскай мовы ў індаеўрапейскай моўнай сям'і. Перыядызацыя гісторыі лацінскай мовы. Роля лацінскай мовы ў еўрапейскай культуры. Фармаванне лацінскага алфавіту. Фанетычны лад лацінскай мовы. Галосныя. Зычныя. Складападзел. Колькасць склада. Правілы націску | | 2 | | | | | Вуснае апытанне |
| **2.** | **МАРФАЛОГІЯ. СІНТАКСІС. СЛОВАЎТВАРЭННЕ. ЛЕКСІКА. АСНОВЫ РЫМСКАГА ВЕРШАСКЛАДАННЯ** | | **58** | | | | **16** | |
| 2.1. | Занятак 2. Назоўнік. 1-е скланенне назоўнікаў. Прыназоўнік. Спражэнне дзеяслова *sum* у цяперашнім часе абвеснага ладу<br>Граматычны лад лацінскай мовы. Граматычныя катэгорыі назоўнікаў. Звесткі пра скланенне. 1-е скланенне назоўнікаў. Praesens indicativi дзеяслова *sum, fui, –, esse* | | 2 | | | | | Вуснае апытанне |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 2.2. | Занятак 3. Дзеяслоў. Praesens indicativi activi. Infinitivus praesentis activi<br>Граматычныя катэгорыі дзеяслова. Чатыры спражэнні лацінскага дзеяслова. Infinitivus praesentis activi. Асабовыя канчаткі незалежнага стану. Praesens indicativi activi дзеясловаў I, II, IIIа, IIIб, IV спражэнняў. | | 2 | | | | | Вуснае апытанне |
| 2.3. | Занятак 4. КСР. Imperativus praesentis activi. Выказванне забароны<br>Утварэнне imperativus praesentis activi. Выказванне забароны | | | | | | 2 | Пісьмовае апытанне |
| 2.4. | Занятак 5. 2-е скланенне назоўнікаў<br>Гістарычная аснова назоўнікаў 2-га скланення. Сістэма склонавых канчаткаў, род. Асаблівасці скланення ніякага роду. Утварэнне vocativus singularis. Іншыя асаблівасці 2-га скланення | | 2 | | | | | Вуснае апытанне |
| 2.5. | Занятак 6. Прыметнікі 1–2-га скланення. Прыналежныя займеннікі<br>Прыметнікі I групы. Прыналежныя займеннікі. Дапасаванне | | 2 | | | | | Вуснае апытанне |
| 2.6. | Занятак 7. Асабовыя займеннікі. Зваротны займеннік. Указальныя займеннікі. Займеннікавыя прыметнікі. Дзеясловы, утвораныя ад дзеяслова *sum*<br>Скланенне асабовых і зваротнага займеннікаў. Суплетыўнасць формаў. Genetivus partitivus. Постпазітыўнае ўжыванне прыназоўніка *cum*. Указальныя займеннікі *is*, *ea*, *id*; *ille*, *illa*, *illud*; *iste*, *ista*, *istud*: скланенне, ужыванне, пераклад. Займеннікавыя прыметнікі: скланенне, ужыванне. Praesens indicativi дзеясловаў, утвораных ад *sum* | | 2 | | | | | Вуснае апытанне |
| 2.7. | Занятак 8. Praesens indicativi passivi. Infinitivus praesentis passivi. Незалежная і залежная канструкцыі<br>Асабовыя канчаткі залежнага стану сістэмы інфекта. Praesens indicativi passivi. Сінтаксіс залежнай канструкцыі. Ablativus auctoris. Ablativus instrumenti | | 2 | | | | | Вуснае апытанне |
| 2.8. | Занятак 9. Imperfectum indicativi activi et passivi<br>Imperfectum indicativi activi et passivi правільных дзеясловаў. Imperfectum indicativi дзеяслова *sum* і вытворных ад яго | | 2 | | | | | Вуснае апытанне |
| 2.9. | Занятак 10. Futurum I indicativi activi et passivi<br>Futurum I indicativi activi et passivi правільных дзеясловаў. Futurum I indicativi дзеяслова *sum* і вытворных ад яго | | 2 | | | | | Вуснае апытанне |
| 2.10. | Занятак 11. 3-е скланенне назоўнікаў<br>Гістарычная аснова назоўнікаў 3-га скланення. Тыпы 3-га скланення назоўнікаў: зычны, галосны, змешаны. Сістэма склонавых канчаткаў. Правіла роду і выключэнні з яго. Утварэнне nominativus singularis | | 2 | | | | | Вуснае апытанне |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 2.11. | Занятак 12. КСР. Асаблівасці назоўнікаў 3-га скланення<br>Асаблівасці назоўнікаў 3-га скланення | | | | | | 2 | Пісьмовае апытанне |
| 2.12. | Занятак 13. Прыметнікі 3-га скланення<br>Прыметнікі II групы. Прыметнікі трох канчаткаў. Прыметнікі двух канчаткаў. Прыметнікі аднаго канчатка | | 2 | | | | | Вуснае апытанне |
| 2.13. | Занятак 14. Асноўныя формы дзеяслова. Perfectum indicativi activi<br>Асноўныя формы дзеяслова. Тры асновы дзеяслова. Стандартныя і нестандартныя дзеясловы. Сістэма перфекта. Асабовыя канчаткі незалежнага стану перфекта. Perfectum indicativi activi. Асноўныя формы дзеяслова *sum* і вытворных ад яго | | 2 | | | | | Вуснае апытанне |
| 2.14. | Занятак 15. Plusquamperfectum indicativi activi. Futurum II indicativi activi<br>Plusquamperfectum indicativi activi. Futurum II indicativi activi | | 2 | | | | | Вуснае апытанне |
| 2.15. | Занятак 16. Дзеепрыметнікі<br>Participium praesentis activi, participium perfecti passivi, participium futuri activi: утварэнне, скланенне, ужыванне. Conjugatio periphrastica activa | | 2 | | | | | Вуснае апытанне |
| 2.16. | Занятак 17. КСР. Perfectum indicativi passivi. Plusquamperfectum indicativi passivi. Futurum II indicativi passivi<br>Утварэнне аналітычных формаў залежнага стану. Perfectum indicativi passivi. Plusquamperfectum indicativi passivi. Futurum II indicativi passivi | | | | | | 2 | Пісьмовае апытанне |
| 2.17. | Занятак 18. КСР. 4-е скланенне назоўнікаў. 5-е скланенне назоўнікаў<br>4-е скланенне назоўнікаў: гістарычная аснова, род, сістэма склонавых канчаткаў. 5-е скланенне назоўнікаў: гістарычная аснова, род, сістэма склонавых канчаткаў. Асаблівасці скланення і ўжыванні некаторых назоўнікаў | | | | | | 2 | Пісьмовае апытанне |
| 2.18. | Занятак 19. Выніковая кантрольная работа | | 2 | | | | | Пісьмовае апытанне |

## III семестр

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 2.19. | Занятак 1. Лічэбнік<br>Колькасныя, парадкавыя, раздзяляльныя, лічэбнікі-прыслоўі. Скланенне лічэбнікаў. Ужыванне склонавых формаў імён пры колькасных лічэбніках. Дапасаванне лічэбнікаў да назоўнікаў | | 2 | | | | | Вуснае апытанне |
| 2.20. | Занятак 2. КСР. Указальныя, адносныя, адмоўныя, няпэўныя займеннікі<br>Указальныя, адносныя, адмоўныя, няпэўныя займеннікі | | | | | | 2 | Пісьмовае апытанне |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 2.21. | Занятак 3. Ступені параўнання<br>Ступені параўнання прыметнікаў: gradus comparativus, gradus superlativus. Сінтаксіс склонаў пры ступенях параўнання: ablativus comparationis, genetivus partitivus. Суплетыўныя ступені параўнання. Прыслоўі. Ступені параўнання прыслоўяў | | 2 | | | | | Вуснае апытанне |
| 2.22. | Занятак 4. Зварот accusativus cum infinitivo<br>Infinitivi. Accusativus cum infinitivo | | 2 | | | | | Вуснае апытанне |
| 2.23. | Занятак 5. Адмысловы выпадак звароту accusativus cum infinitivo<br>Адмысловы выпадак звароту accusativus cum infinitivo | | 2 | | | | | Вуснае апытанне |
| 2.24. | Занятак 6. Зварот nominativus cum infinitivo<br>Nominativus cum infinitivo. Ужыванне займеннікаў у якасці лагічнага дзейніка | | 2 | | | | | Вуснае апытанне |
| 2.25. | Занятак 7. Зварот ablativus absolutus<br>Кампаненты звароту ablativus absolutus. Спосабы перакладу звароту ablativus absolutus | | 2 | | | | | Вуснае апытанне |
| 2.26. | Занятак 8. Адмысловы выпадак звароту ablativus absolutus<br>Адмысловы выпадак звароту ablativus absolutus | | 2 | | | | | Вуснае апытанне |
| 2.27. | Занятак 9. КСР. Адкладальныя і паўадкладальныя дзеясловы<br>Адкладальныя дзеясловы. Паўадкладальныя дзеясловы | | | | | | 2 | Пісьмовае апытанне |
| 2.28. | Занятак 10. Conjunctivus у незалежным сказе<br>Кан’юнктыў: агульная характарыстыка. Praesens conjunctivi. Imperfectum conjunctivi. Значэнні conjunctivus у незалежным сказе | | 2 | | | | | Вуснае апытанне |
| 2.29. | Занятак 11. Даданыя сказы з *ut*<br>Даданыя сказы мэты. Даданыя сказы дапаўняльныя. Даданыя сказы выніку. Ужыванне часавых форм | | 2 | | | | | Вуснае апытанне |
| 2.30. | Занятак 12. Ускоснае пытанне<br>Perfectum conjunctivi. Plusquamperfectum conjunctivi. Consecutio temporum. Ускоснае пытанне | | 2 | | | | | Вуснае апытанне |
| 2.31. | Занятак 13. Даданыя сказы з *cum*<br>Даданыя сказы часу. Даданыя сказы прычыны | | 2 | | | | | Вуснае апытанне |
| 2.32. | Занятак 14. Даданыя сказы з *si*<br>Даданыя сказы ўмовы. Casus realis. Casus potentialis. Casus irrealis | | 2 | | | | | Вуснае апытанне |
| 2.33. | Занятак 15. КСР. Няправільныя дзеясловы<br>Няправільныя дзеясловы | | | | | | 2 | Пісьмовае апытанне |
| 2.34. | Занятак 16. Даданыя сказы ўступальныя<br>Даданыя сказы ўступальныя | | 2 | | | | | Вуснае апытанне |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 2.35. | Занятак 17. Герундый. Герундыў<br>Утварэнне і ўжыванне gerundium. Утварэнне і ўжыванне gerundivum. Conjugatio periphrastica passiva | | 2 | | | | | Вуснае апытанне |
| 2.36. | Занятак 18. КСР. Чытанне аўтарскіх тэкстаў<br>Цэзар. «Нататкі пра Гальскую вайну». М. Гусоўскі. «Песня пра зубра» | | | | | | 2 | Пісьмовае апытанне |
| 2.37. | Занятак 19. Выніковая кантрольная работа | | 2 | | | | | Пісьмовае апытанне |

## Б. ЗАВОЧНАЯ ФОРМА АТРЫМАННЯ АДУКАЦЫІ

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | Семінарскія заняткі | Лабараторныя заняткі | Іншае | | |

## III семестр

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **1.** | **УВОДЗІНЫ. ФАНЕТЫКА І ГРАФІКА** | | **2** | | | | | |
| 1.1. | Занятак 1. Гісторыя лацінскай мовы. Фанетыка і графіка<br>Месца лацінскай мовы ў індаеўрапейскай моўнай сям'і. Перыядызацыя гісторыі лацінскай мовы. Роля лацінскай мовы ў еўрапейскай культуры. Фармаванне лацінскага алфавіту. Фанетычны лад лацінскай мовы. Галосныя. Зычныя. Складападзел. Колькасць склада. Правілы націску | | 2 | | | | | Вуснае апытанне |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **2.** | **МАРФАЛОГІЯ. СІНТАКСІС. СЛОВАЎТВАРЭННЕ. ЛЕКСІКА. АСНОВЫ РЫМСКАГА ВЕРШАСКЛАДАННЯ** | | **18** | | | | | |
| 2.1. | Занятак 2. Назоўнік. 1, 2, 3, 4, 5-е скланенне назоўнікаў. Прыназоўнік<br>Граматычны лад лацінскай мовы. Граматычныя катэгорыі назоўнікаў. Звесткі пра скланенне. 1-е скланенне назоўнікаў. 2-е скланенне назоўнікаў. 3-е скланенне назоўнікаў. Тыпы 3-га скланення назоўнікаў: зычны, галосны, змешаны.. Правіла роду і выключэнні з яго. Утварэнне nominativus singularis. Асаблівасці назоўнікаў 3-га скланення. 4-е скланенне назоўнікаў. 5-е скланенне назоўнікаў. Асаблівасці скланення і ўжыванні некаторых назоўнікаў | | 2 | | | | | Вуснае апытанне |

## IV семестр

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
